# МАГЧЫМАСЦІ ЎРОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ДЛЯ ФАРМІРАВАННЯ РЭФЛЕКСІЎНЫХ УМЕННЯЎ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

*Савіцкая Вольга Мікалаеўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Для паспяховай арганізацыі адукацыйнага працэсу настаўніку трэба валодаць у першую чаргу не ведамі па тым ці іншым прадмеце, а тэхнікамі арганізацыі разумення і вывядзення ў рэфлексіўную пазіцыю. Для таго каб бачыць сітуацыю і арганізаваць сітуацыйную рэфлексію, педагогу неабходныя розныя гульнявыя сродкі, перш за ўсё, ён павінен валодаць прыёмамі праблематызацыі і сістэматызацыі (працэсу, сітуацыі, зместу тэксту).

Відавочна, што, калі ўся дзейнасць настаўніка мае сваёй мэтай фарміраванне ў  вучня рэфлексіўных уменняў, прынцыпова іншымі павінны стаць змест і сродкі кантролю.

На ўроках важна вучыць малодшых школьнікаў выконваць наступныя рэфлексіўныя дзеянні:

– самастойнае вызначэнне мэты вучэбнай дзейнасці і вучэбных задач;

– самадыягностыка і самаацэнка сваіх магчымасцяў перад вывучэннем тэмы;

– самастойная работа па ліквідацыі прабелаў у ведах, пашырэнні і паглыбленні ведаў, неабходныя для паспяховага вывучэння новага матэрыялу;

– ажыццяўленне прагназуючага самакантролю, г. зн. вызначэнне, у якой паслядоўнасці будуць выконвацца дзеянні і якімі правіламі варта кіравацца;

– рацыянальнае выкарыстанне агульных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і прыёмаў вучэбнай працы;

– пакрокавы і выніковы самакантроль;

– самастойнае выпраўленне памылак;

– самаацэнка сваіх поспехаў у дасягненні мэты;

– планаванне і ажыццяўленне дзейнасці па самакарэкцыі [1, с. 54].

Для арганізацыі адукацыйнага працэсу настаўніку неабходны спецыяльныя сродкі. Гэта табло планавання і ўліку рэфлексіўных уменняў, праграмы некаторых відаў заняткаў, прыёмы працы навучэнцаў, асаблівым чынам аформлены навучальныя тэксты, алгарытмы.

Пастаўленая перад чалавекам праблемная сітуацыя патрабуе ад яго рэфлексіўнай рэарганізацыі ўласнага мыслення і выступае ў выніку як творчае рашэнне праблемы.

Неабходна адзначыць той факт, што ў працэсе асэнсавання вучнем праблемнай сітуацыі адбываецца змена яго адносін да самога сябе, да ўласнай пазнавальнай дзейнасці, гэта значыць, фарміруецца такі рэфлексіўных навык,

як самаацэначная дзейнасць. Змяняюцца адносіны вучня да ведаў і ўменняў, да іх пераўтварэння, неабходнага для дасягнення выніку.

Такім чынам, «рэфлексія накіравана на пошук прычыны няўдач і цяжкасцяў, у ходзе чаго ўсведамляецца, што сродкі, якія выкарыстоўваюцца, не адпавядаюць задачам, фарміруецца крытычнае стаўленне да ўласных сродкаў, затым да ўмоў задачы, выкарыстоўваецца больш шырокае кола сродкаў, вылучаюцца здагадкі, гіпотэзы, адбываецца інтуітыўнае рашэнне (на неўсвядомленым узроўні) данай праблемы (гэта значыць знаходзіцца рашэнне ў прынцыпе), а затым ужо адбываецца лагічнае абгрунтаванне і рэалізацыя рашэння» [2, с. 54].

Калі чалавеку прапануецца праблемная сітуацыя, а затым яе рэфлексіўнае даследаванне, з’яўляецца аб’ектыўна неабходны новы навык. З’яўленне і развіццё такіх рэфлексіўных навыкаў, як самарэгуляцыя, самавызначэнне, самаразвіццё і самаацэначная дзейнасць і г. д., павышаюць агульны інтэлектуальны і асобасны ўзровень чалавека, спрыяюць больш паспяховаму засваенню навучаемага матэрыялу.

Выкарыстоўваючы рэфлексіўную практыку ў педагагічнай дзейнасці, важна звяртаць увагу на тры асноўныя кампаненты. Па-першае, неабходна вызначыць, развіццё якой сферы (або сфер) важней за ўсё дыягнаставаць, для чаго будзе выкарыстоўвацца рэфлексія на ўроку, якую ролю павінны адыграць сама працэдура правядзення рэфлексіі і яе вынікі.

Па-другое, сапраўды эфектыўная методыка рэфлексіі, хаця б на ўзроўні гіпотэзы, павінна даваць уяўленне аб магчымых прычынах зафіксаваных у ходзе рэфлексіўнай дзейнасці змяненняў. Лепш, калі гэтыя прычыны будуць устаноўлены самімі малодшымі школьнікамі. Вельмі інфарматыўнай у гэтай сувязі з’яўляецца тэхналогія «Рефлексіўная мішэнь», якая дае магчымасць атрымаць рэфлексіўную карціну вучэбнай групы адразу па некалькіх паказчыках.

Трэці кампанент – ацэнка ўдзельнікамі педагагічнага працэсу прадуктыўнасці свайго развіцця ў выніку праведзенага ўзаемадзеяння. Дадзены кампанент прадугледжвае наяўнасць прадуманых і дастаткова дакладных крытэрыяў-арыенціраў для правядзення рэфлексіі.

Прывядзём прыклады выкарыстання рэфлексіі на ўроках беларускай мовы ў пачатковых класах.

*Тэхналогія «Дрэва жыцця».* Настаўнік перад пачаткам урока раздае кожнаму вучню аркушы паперы. Вучні працуюць па алгарытме.

– Уважліва паглядзі на малюнак. А цяпер паспрабуй ацаніць сваё месца на гэтым «Дрэве жыцця». Выберы сабе аднаго чалавечка з дваццаці, які найбольш адпавядае твайму настрою на даны момант урока. А цяпер паспрабуй ацаніць сваё месца на гэтым «Дрэве жыцця». Размалюй свайго чалавечка.

Напішы пра яго невялікае апавяданне (4–5 сказаў): хто ён, пра што думае, да чаго імкнецца, пра што марыць.

*Мой чалавечак – гэта…*

Заканчваецца рэфлексія пажаданнямі настаўніка, які падводзіць вынікі, жадае творчага натхнення, трываласці, каб заўсёды верылі ў дабро і міласэрнасць.

*Тэхналогія «Пялёсткі».* У пачатку ўрока кожны вучань атрымлівае білет у цудоўную краіну паэзіі. На этапе рэфлексіі настаўнік загадвае дзецям скласці пялёсткі напалову і на адной палове пялёстка напісаць, з якім настроем яны пакідаюць урок. Пялёсткі прымацоўваюцца да кветкі, якая на дошцы.

– Мы таксама стварылі свой сімвал прыгажосці. Давайце даведаемся, які настрой сёння ў нашай кветкі (Настаўнік зачытвае, што вучні напісалі на пялёстках.)

*Тэхналогія «Вынік».*

– Які ў вас настрой? Якое адчуванне?

– Якія віды работы вам найбольш спадабаліся?

— Ці быў для вас карысным урок не толькі з пункту гледжання ўзнаўлення матэрыялу па тэме? Чым?

– Як вы лічыце, ці справіліся мы з задачамі, пастаўленымі на пачатку ўрока?

– Я даведалася (аўся), што…

*Тэхналогія «Трохкутнік».*

– Хто з вас аказаўся на вяршыні ведаў па тэме? (Вучні падымаюць рукі, настаўнік запісвае колькасць у піраміду.)

– У каго засталіся пытанні па тэме? (Вучні падымаюць рукі, настаўнік запісвае колькасць у піраміду.)

– Каму яшчэ трэба папрацаваць? (Вучні падымаюць рукі, настаўнік запісвае колькасць у піраміду.)

– Што было больш цікавым?

*Тэхналогія «Размясці сцікер».*Вучні насупраць абранай фразы на дошцы прыклейваюць сцікеры.

– Мне ўсё было зразумела, я ўсё паспеў(-ла) зрабіць.

– Мне ўсё было зразумела, але трэба больш часу на роздум.

– Мне не ўсё было зразумела, але я стараўся(-лася).

– Я мала што зразумеў(-ла).

*Тэхналогія «Закончыце фразу».* Закончыце фразу (па ланцужку):

– Гэты ўрок мне запомніцца, таму што .. або мне не запомніцца, таму што ..

– Я ведаю добра .. .

– Выклікалі цяжкасці заданні .. .

– Трэба працаваць над .. .

*Тэхналогія «Тварыкі».*

– Зараз мы высветлім, з якім настроем вы вяртаецеся з падарожжа. Калі вам усё спадабалася на ўроку, пакажыце тварык з усмешкай; калі вы былі

абыякавыя – спакойны тварык; калі нешта не зразумелі або вам было нецікава – сумны тварык.

*Тэхналогія «Птушкі».* У вас на партах – птушкі, а на дошцы вісіць кармушка. Хто на ўроку сумаваў, каму было нецікава – пасадзіце сваю птушку далёка ад кармушкі. А каму было цікава на ўроку і ўсё атрымлівалася – пасадзіце сваю птушку ў кармушку.

*Тэхналогія «Меркаванне»* (малодшым школьнікам прапануюцца карткі):

– Урок быў карысны для розуму і сэрца.

– Урок прымусіў задумацца.

– Урок прынёс задавальненне.

Тэхналогія «Галоўнае слова». На маленькіх аркушах паперы напісаць толькі адно слова, якое адлюстроўвае галоўны змест урока.

Такім чынам, каб фарміраваць рэфлексіўныя ўменні малодшых школьнікаў, неабходна:

– зрабіць рэфлексію адным з кампанентаў зместу адукацыі;

– даваць магчымасць вучням пачатковых класаў актыўна дзейнічаць у кожнай канкрэтнай сітуацыі, а затым ўсведамляць свае дзеянні;

– настаўніку самому валодаць тэхнікамі арганізацыі разумення і вывядзення ў рэфлексіўную пазіцыю;

– пастаянна выкарыстоўваць спецыяльныя сродкі для арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Дьюи, Д. Психология и педагогика мышления / Д. Дьюи. – М. : Просвещение, 1997. – 477 с.

2. Браницкая, О. В. Приемы рефлексивных технологий в начальной школе / О. В. Браницкая // Начальная школа. – 2009. – № 12. – С. 1–15.